За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 10 (81) Кастрычнік 2013 г.

Будзьце ўважлівыя і асьцярожныя: віцебскія адвакаты



Алена Шандзюкова

Актывістка Беларускага прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці (БПР РЭП) Алена Шандзюкова зьвярнулася ва Ўпраўленьне сьледчага камітэту па Віцебскай вобласьці з заявай, у якой яна просіць прыцягнуць групу віцебскіх адвакатаў і судзьдзю Кастрычніцкага суду Віцебску да крымінальнай адказнасьці.

Яшчэ ўвесну бягучага году, выконваючы вызначэньне судзьдзі Чыгуначнага суду Віцебску Сьвятланы Варатынскай, Алена Шандзюкова зьвярнулася ў юрыдычную кансультацыю № 2 Віцебску па юрыдычную дапамогу. Ёй быў патрэбны адвакат для абароны яе правоў у судзе па грамадзянскай справе.

У юркансультацыі № 2 Шандзюкова наняла адваката Натальля Станкевіч, заплаціўшы ў касу ўстановы 500 тысяч рублёў за вядзеньне справы ў судзе. Аднак адвакат Станкевіч, не тлумачачы прычын, ні разу не зьявілася на судовыя паседжаньні, але праз тэлефон абяцала туды зьявіцца пры наяўнасьці ў яе магчымасьцяў - гэта значыць, пастаянна падманвала свайго кліента.

Каб прымусіць адваката выконваць свае службовыя абавязкі, Алена зьвярнулася па дапамогу да яе непасрэднага начальніка — загадчыцы юркансультацыі № 2 Тацьцяны Ткачонак. Аднак гэты зварот ня меў выніку — адвакатка ў суд не зьявілася.

Зварот па дапамогу да старшыні Віцебскай абласной калегіі адвакатаў Аліны Пужэвіч меў такі самы адмоўны вынік — адвакат адмовілася выконваць дамоўныя забавязаньні.

Скарга, накіраваная начальніку Галоўнага ўпраўленьня юстыцыі Віцебскага аблвыканкаму А.І. Лескаўца на бязьдзейнасьць прадстаўнікоў адвакацкай супольнасьці, была разгледжаная з нулявым вынікам для прафсаюзнай актывісткі.

Пасьля доўгіх пакут, жанчына была вымушаная наняць іншага адваката, які давёў справу Алены да канца.

Палічыўшы, што адвакат Станкевіч ня выканала пэўных пунктаў заключанай зь ёй дамовы, Шандзюкова паспрабавала вярнуць свае грошы — суму перадаплаты з касы юркансультацыі № 2, але грошы ёй не вярнулі.

Тады Алена зьвярнулася ў Кастрычніцкі суд з пазоўнымі патрабаваньнямі. Яна папрасіла суд спагнаць зь юркансультацыі № 2 перадаплату за вядзеньне грамадзянскай справы ў судзе, а таксама спагнаць зь яе і зь Віцебскай абласной калегіі адвакатаў грошы ў суме адзін мільён рублёў з кожнай установы — грашовую кампэнсацыю за прычыненую маральную шкоду.

Гэтым разам ніводзін адвакат гораду ня ўзяў на сябе сьмеласьці ўдзельнічаць у справе супраць адвакатаў, спаслаўшыся на прафэсійную этыку і салідарнасьць.

Судзьдзя Вікторыя Лешчанка, якая разглядала справу, двойчы адмовіла Шандзюковой у задавальненьні яе хадайніцтва пра допуск да ўдзелу ў справе прававога інспэктара БПР РЭП Валера Місьнікава. Валер меў усе падставы быць абаронцам Шандзюковой ў судзе, бо меў даверанасьць, выдадзеную прафсаюзам. На яго думку, пазбавіўшы актывістку права на абарону, судзьдзя Лешчанка зьдзейсьніла супрацьзаконнае дзеяньне.

Алена Шандзюкова ўпэўненая, што судзьдзя вяла судовы працэс прадузята, адкрыта прыняўшы бок адвакатаў. У яе склалася ўражаньне, што судзьдзя Лешчанка не чыніла правасудзьдзе, а зладзіла падабенства спаборніцтва паміж трыма шматвопытнымі юрыстамі-адвакатамі і ёю — непісьменнай ў прававых пытаньнях жанчынай.

Каб спыніць гэтае бязладзьдзе, Алена падала матываваны і законам абгрунтаваны адвод судзьдзі Лешчанкі, які быў беспадстаўна адхілены. Вынікам гэтага судовага зьдзеку стала адмова Шандзюковой ў пазове да адвакатаў. Больш таго, судзьдзя Лешчанка пастанавіла спагнаць з пазоўніцы дзяржаўную пошліну ў памеры 805 тысяч рублёў.

«Усе паводзіны адвакатаў, а пасьля судзьдзі казалі мне пра тое, што гэтыя асобы — разам; яны выкарыстоўваюць службовае становішча, ўзбагачаюць сябе праз адкрытае парушэньне канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законаў, правоў і законных інтарэсаў тых, хто да іх зьвярнуўся, наіўна верачы ў іх прыстойнасьць і добрасумленнае выкананьне службовых абавязкаў за адну зарплату», — сказала Алена Шандзюкова.

«Цяпер я ўжо перакананая, што махляркі-цыганкі больш высакародныя ў сваіх дзеяньнях (махлярства бо ж гэта іх праца), чым махляркі — адвакаты і судзьдзя, бо ў іх характэрная рыса адукаванасьць, веданьне законаў, а праца — праваабарона і правасудзьдзе, але не махлярства. Аднак выйшла інакш», — з крыўдай наракае прафсаюзная актывістка.

Адзіным выйсцем з сытуацыі, што склалася, Алена Шандзюкова бачыць прыцягненьне службовых асоб — судзьдзі Лешчанка, адвакаткі юркансультацыі № 2 Станкевіч і загадчыцы гэтай жа кансультацыі Ткачонак, а гэтаксама старшыні Віцебскай абласной калегіі адвакатаў Пужэвіч — да крымінальнай адказнасьці.

Актывіст Леанід Здрэстаў дамогся пакараньня віцебскіх судзьдзяў



Леанід Здрэстаў

Двойчы Віцебскі абласны суд адмяняў пастановы, вынесеныя судзьдзямі суду Кастрычніцкага раёну Віцебску, аб адмове распачаць справы паводле скаргаў жыхара Віцебскага раёну **Леаніда Здрэстава** супраць УП «Віцебскаблгаз». Таксама двойчы скаргі актывіста ўсё-такі разглядаліся ў судовых паседжаньнях, рашэньні па іх прымаліся — не на карысьць актывіста, але потым гэтыя рашэньні аблсудом былі прызнаныя незаконнымі і скасаваныя. У выніку актывіст паскардзіўся ўжо на судзьдзяў. Ён напісаў Лукашэнку, і быў пачуты: у дачыненьні да дваіх судзьдзяў прынятыя меры ўзьдзеяньня.

Першай, хто вынес незаконнае — як пазьней прызнаў Віцебскі абласны суд — рашэньне наконт адмовы ва ўзбуджэньні справы па скарзе Леаніда Здрэстава стала намесьніца старшыні суду Кастрычніцкага раёну Віцебску Алена Папкова. Потым яе шляхам пайшла судзьдзя Вікторыя Лешчанка, якая пакінула бяз руху скаргу актывіста аб абароне правоў спажыўцоў — і гэта, як пацьвердзіў абласны суд, ізноў было незаконна. Нарэшце, два разы скаргі ўсё-такі разглядаліся ў Кастрычніцкім райсудзе, абодва разы судзьдзёй Натальляй Лях. І кожная з пастановаў, вынесеных судзьдзёй Лях наконт справы, таксама аказалася незаконнай...

На думку актывіста, судзьдзі раённага суду наўмысна выносілі свае відавочна незаконныя рашэньні, пазбаўляючы яго права на справядлівы судовы разбор. «Адмена дзьвюх судовых пастановаў паводле адной і той жа справы — гэта рэцыдыў беззаконьня. Калі ж прызнаюцца незаконнымі тры пастановы аднаго суду паводле адной справы — гэта ўжо за межамі здаровага сэнсу. Пасьля гэтага судзьдзям, датычным да такога, не павінна больш заставацца месца ў судовай сыстэме дзяржаве», — мяркуе Леанід Здрэстаў. Менавіта так ён напісаў кіраўніку дзяржавы, просячы апошняга разабрацца ў сытуацыі і прыняць адпаведныя арганізацыйныя і кадравыя рашэньні.

Зразумела, зварот актывіста трапіў не на стол прэзыдэнту, а ў яго адміністрацыю. Адміністрацыя перанакіравала зварот у Вярхоўны суд, які зладзіў праверку і пацьвердзіў, што парушэньні з боку судзьдзяў сапраўды мелі месца.

У выніку ў дачыненьні да судзьдзі суду Кастрычніцкага раёну Віцебску Натальлі Лях, што парушыла закон, узбуджаная дысцыплінарная вытворчасьць, якая накіраваная на разгляд у кваліфікацыйную калегію судзьдзяў Віцебскага абласнога суду; а выконваючы абавязкі начальніка галоўнага ўпраўленьня юстыцыі аблвыканкаму прыняў рашэньне аб пазбаўленьні судзьдзі Лях прэміі за жнівень.

Парушэньні закону з боку судзьдзяў пры разглядзе скаргаў Леаніда Здрэстава былі абмеркаваныя і на апэратыўнай нарадзе ў галоўным упраўленьні юстыцыі Віцебскага аблвыканкаму. Вынік нарады: намесьніцы старшыні Кастрычніцкага райсуду Віцебску Алене Папковай было паказана на неабходнасьць строгага выкананьня закону і ажыцьцяўленьня належнага кантролю падчас разгляду грамадзянскіх спраў іншымі судзьдзямі.

Пасьля ўсіх разьбіральніцтваў сухой з вады выйшла толькі судзьдзя Вікторыя Лешчанка. Вярхоўны суд паведаміў Леаніду Здрэставу, што не знаходзіць падставаў для прыцягненьня яе да адказнасьці.

Гісторыя, здаецца, блізіцца да завяршэньня. Мабыць, цяпер, пасьля ўсяго, Леанід Здрэстаў нарэшце зможа атрымаць доступ да справядлівага бесстароннага суду. Але выпадак Здрэстава не адзінкавы, таму па завяршэньні яго гісторыі застаецца пытаньне: Ці не нагадвае сёньняшняя Рэспубліка Беларусь не эўрапейскую прававую дзяржаву пачатку XXI стагодзьдзя, дзе дзейнічае вяршэнства права і свае законныя інтарэсы кожны чалавек можа адстаяць у незалежным судзе, а нейкую дэспатыю Усходу часоў Сярэднявечча, пры якой, каб дамагчыся праўды, чалавеку не заставалася нічога іншага, як толькі наўпрост або праз набліжаных да трону зьвяртацца да манарха, спадзеючыся, што той міласэрна пачуе яго і будзе літасьцівы да яго прашэньняў?

Віцебскі абласны суд ігнаруе ўказ прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь?

Згодна з указам кіраўніка Беларусі «Аб мерах па ўдасканаленьні выкарыстаньня нацыянальнага сэгмэнту сеціва Інтэрнэт», «дзяржаўныя органы і арганізацыі забясьпечваюць стварэньне, функцыянаваньне і сыстэматычнае абнаўленьне інтэрнэт-сайтаў з выкарыстаньнем інфармацыйных сетак, сыстэм і рэсурсаў нацыянальнага сэгмэнту сеціва Інтэрнэт, разьмешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь». Аднак, здаецца, віцебскаму абласному суду ўказ прэзыдэнта — ня ўказ. Яго сайт фізычна разьмешчаны не ў Беларусі, а ў Эстоніі...

Сайт Віцебскага абласнога суду, спасылку на які падае афіцыйны сайт Віцебскага гарадзкога выканаўчага камітэту, такі: www.vitoblsud.by. Няцяжка высьветліць IP-адрас сэрвэру, дзе галоўны судовы орган Віцебскай вобласьці разьмясьціў свой рэсурс — 159.253.21.202; і, згодна з адкрытымі крыніцамі інфармацыі, гэты сэрвэр знаходзіцца не «на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», як таго патрабуе ўказ Лукашэнкі, а за мяжою — у Эстоніі.

На тым самым сэрвэры ў Эстоніі зьмяшчаецца некалькі дзясяткаў іншых сайтаў, датычных культуры, бізнэсу і, вельмі шмат, турызму. Цікава, што сярод сайтаў, што суседнічаюць на адным сэрвэры з пляцоўкай Віцебскага абласнога суду, нямала і зарэгістраваных у Беларусі з даменным імем .by.

Зрэшты, сайт Віцебскага абласнога суду, спасылку на які ў якасьці гэтакага зьмяшчае гарвыканкам, паводле сваёй формы і зьместу больш нагадвае не афіцыйны рэсурс дзяржаўнага органа, а нейкі аматарскі блог. На ім адсутнічае якая-небудзь інфармацыя пра працу суду. Затое ў стужцы навін ёсьць матэрыял ад 23 чэрвеня 2013 г. пра справу Андрэя Гайдукова, якога ў той час у Віцебскім аблсудзе судзілі. У гэтым матэрыяле ў якасьці крыніцы інфармацыі пазначаная лідэрка апазыцыі Таццяна Севярынец, і, больш таго, сам падсудны называецца «палітзьняволеным» — вельмі адважнае прызнаньне для дзяржаўнага органу судовай улады!

Можна дапусьціць, што віной усяму — нейкія падкопы апазыцыйна настроеных вэбмайстроў сайту гарвыканкаму, якія замест спасылкі на сапраўдны сайт Віцебскага абласнога суду знарок разьмясьцілі спасылку на «левы» рэсурс, невядомыя аўтары якога немаведама як змаглі зарэгістраваць дамэн .by у беларускім нацыянальным сэгмэнце. Але тады ўзьнікае пытаньне: А дзе ж тады іншы, «праўдзівы», сайт Віцебскага абласнога суду? Ці існуе ён у прыродзе?

Інвалід застаўся без сацыяльнага жытла

Віцебскі гарадзкі выканаўчы камітэт адмовіўся ўнесьці ў асобныя сьпісы на атрыманьне жылога памяшканьня сацыяльнага карыстаньня інваліда другой групы праваабаронцу Валера Місьнікава. Фармальнай прычынай таму стала даведка пра месца жыхарства і склад сям'і, выдадзеная Місьнікаву разьліковым цэнтрам № 4 дзяржаўнага прадпрыемства «ЖРЭТ Першамайскага раёну».

Згодна зь дзейным заканадаўствам, непрацуючыя самотныя інваліды першай і другой груп, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэньні жыльлёвых умоў, маюць права на атрыманьне жылога памяшканьня сацыяльнага карыстаньня дзяржаўнага жыльлёвага фонду.



Валер Місьнікаў

Валер Місьнікаў, без усялякіх сумневаў, належыць да гэтай вызначанай заканадаўствам катэгорыі грамадзян: у цяперашні час ён самотна пражывае ў здымным пакоі, нідзе не працуе і мае толькі адну крыніцу даходу — пэнсію, прызначаную яму па дасягненьні пэнсійнага веку.

Значную частку пэнсіі складаюць камунальныя плацяжы. Бо Валер аплачвае поўны кошт камунальных паслуг, бо льготы, якія быццам бы належаць яму паводле закону, не распаўсюджваюцца на інвалідаў, што арандуюць жытло.

Былая жонка і двое яго паўнагадовых дзяцей пражываюць асобна. Яны доўгія гады жывуць асобна, не вядуць з Валерам сумеснай гаспадаркі, не падтрымліваюць яго ані маральна, ані матэрыяльна. Фактычна, гэта чужыя людзі. Таму Місьнікаў лічыць сябе грамадзянінам, якія пражывае самотна, і былым членам сям'і, што, здавалася б, мусіць дазволіць яму атрымаць сацыяльнае жытло.

Аднак даведка пра месца жыхарства і склад сям'і, выдадзеная разьліковым цэнтрам № 4 ЖРЭТу цалкам перакрэсьліла ўсе надзеі Валерыя. Бо ў даведцы пазначана, што В. Місьнікаў зарэгістраваны і пражывае ў кватэры сумесна з былой жонкай і мае сям'ю ў складзе чатырох чалавек. Гэта значыць, згодна з даведкай, Місьнікаў зусім не самотны грамадзянін, а муж і бацька, якім апякуюцца жонка і дзеці. На падставе выдадзенага ЖРЭТам дакумэнту, Віцебскі гарвыканкам адмовіў Місьнікаву ў залічэньні яго ў сьпісы на атрыманьне сацыяльнага жытла.

Па абарону сваіх правоў і законных інтарэсаў Валер Місьнікаў зьвярнуўся ў суд Першамайскага раёну Віцебску з пазовам аб прызнаньні несапраўднай даведкі ЖРЭТу і надзяленьнем яго статусам самотнага грамадзяніна і статусам былога члена сям'і. Аднак судзьдзя Натальля Броўка адмовіла Місьнікаву ў задавальненьні яго патрабаваньняў. Яна палічыла, што аргумэнты праваабаронцы неперaканаўчыя, а паказаньні сьведак пра яго фактычнае самотнае пражываньне не заснаваныя на нормах заканадаўства.

Зварот да памочніка прэзыдэнта краіны, галоўнага інспэктара па Віцебскай вобласьці Дамашкевіча ня даў плёну. На асабістым прыёме Валер Місьнікаў падрабязна распавёў памочніку кіраўніка дзяржавы пра сутнасьць сваёй справы, і той паабяцаў разабрацца.

Па даручэньні Дамашкевіча ў справе разьбіраўся кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкаму Аляксей Мацюшка. Апошні паведаміў: «Факт пражываньня ў адным з Вамі населеным пункце (г. Віцебску) Вашых працаздольных дзяцей, які паўплываў на прыняцьце Віцебскім гарвыканкамам рашэньня аб адмове ва ўключэньні Вас у асобныя сьпісы на атрыманьне жылога памяшканьня сацыяльнага карыстаньня, пацьвярджаецца даведкай ад 23 сакавіка 2012 г. № 791 аб месцы жыхарства і аб складзе сям'і , выдадзенай разьліковым цэнтрам № 4 дзяржаўнага прадпрыемства "ЖРЭТ Першамайскага раёна". Дакумэнтальнае пацьвярджаньне гэтага факту і прынятае на яго падставе адміністрацыйнае рашэньне ня цягне прысваеньня Вам якога-небудзь прававога статусу неўпаўнаважанай на гэта службовай асобай. Такім чынам, дэкляраваныя Вамі "парушэньні нарматыўных актаў", якія прывялі да ўшчамленьня Вашых правоў і законных інтарэсаў, не знайшлі пацьверджаньня, падставы для прыняцьця мер рэагаваньня адсутнічаюць».

Спробы інваліда адстаяць свае правы і дамагчыся справядлівасьці скончыліся няўдачай. І сапраўдная прычына гэтай няўдачы – зусім не даведка, выдадзеная ЖРЭТам, а бяздушная дзяржаўная бюракратычная машына, якая фармальную паперку ставіць вышэй за жыльлёвыя праблемы інваліда.

Журналістку вінавацяць у п'яным дэбошы



Надзея Куканос

Надзея Куканос была затрыманая міліцыянтамі ў Віцебскім абласным судзе. На яе склалі два пратаколы: за дробнае хуліганства і непадпарадкаваньне законным патрабаваньням супрацоўнікаў аховы правапарадку. На думку міліцыянтаў, журналістка была п'яная, але экспэртыза не пацьвердзіла іх падазрэньні.

Тым ня менш судзьдзя суду Кастрычніцкага раёну Віцебску Алена Протас прызнала жанчыну вінаватай ў парушэньні двух артыкулаў адміністрацыйнага кодэксу і пакарала яе штрафам у памеры 3 мільёнаў рублёў. Надзея Куканос не пагадзілася з рашэньнем суду і абскардзіла яго. Віцебскім абласным судом рашэньне судзьдзі Протас было адмененая і вернутае ў Кастрычніцкі райсуд на новы разгляд іншым судзьдзёй.

За скаргу ў Міндраў актывіст ледзь ня трапіў у вар'ятню



Аляксандар Кірылаў

Віцебскі сябра незарэгістраванай партыі «Белая Русь» Аляксандар Кірылаў праходзіў курс лячэньня ў Рэспубліканскім шпіталі спэлеалячэньня ў Салігорску. Адтуль ён патэлефанаваў на «гарачую лінію» ў Міністэрства аховы здароўя і паскардзіўся на факты п'янак у клініцы, парушэньне правілаў унутранага распарадку, неаказаньне хворым на бясплатнай аснове мэдычных паслуг. Актывіста выслухалі і параілі вырашыць ўсе пытаньні на месцы. Неўзабаве ж пасьля таго, як ён паспрабаваў зрабіць гэта, яму прыйшлося кінуць свае манаткі ў шпіталі і ўцякаць на перакладных дадому ў Віцебск.

Спроба вырашыць праблему «на месцы» распачалася досыць міралюбна. Аляксандра Кірылава прыняў у сваім габінэце галоўурач мэдычнай установы Павал Леўчанка. Ён добразычліва прапанаваў незадаволенаму ўмовамі лячэньня пацыенту прайсьці ў палату і на пісьме выкласьці свае прэтэнзіі, пазначыць факты, даты і прозьвішчы, а таксама даць на подпіс дакумэнт іншым хворым, бо актывіст сьцьвярджаў, што ён не адзін не задаволены ўмовамі ў шпіталі. Аляксандар Кірылаў выйшаў з габінэту і накіраваўся ў палату. Сеўшы за напісаньне калектыўнай заявы, ён не адразу заўважыў, як у палаце зьявіўся міліцыянт...

Маёр міліцыі А.М. Лявончык, які суправаджаўся дзьвюма мэдсёстрамі, пачаў папракаць пацыента, навошта ён скардзіцца ў Міністэрства аховы здароўя, і запатрабаваў тлумачэньняў. Абураны хворы адмовіўся адказваць на пытаньні і паспрабаваў «прарвацца» ў габінэт галоўнага ўрача. Міліцыянт яго не пусьціў, завязалася бойка. Паводле словаў Аляксандра Кірылава, у выніку яму былі нанесеныя траўмы.

Пэрсанал шпіталя выклікаў «хуткую». Лекар Яварчук, якая прыехала на чале брыгады, паспрабавала ўкалоць «буяну» заспакойлівае, але той супраціўляўся. На дапамогу падасьпелі галоўурач і яго намесьнік Натальля Дубовік, якія запатрабавалі псыхіятрычнага агляду Кірылава. Яму заламалі рукі, запхнулі ў машыну і даставілі ў псыханэўралягічны дыспансэр.

Там, у прысутнасьці маёра Лявончыка і групы з чатырох апэратыўных супрацоўнікаў АУС Салігорску быў праведзены агляд. У рэшце рэшт, было заяўлена, што Аляксандар Кірылаў здаровы, і падставаў для яго зьмяшчэньня ў псыхіятрычны дыспансэр няма. «Пакуль няма», — папярэдзілі яго.

Баючыся, што на гэтым справа ня скончыцца, Кірылаў вырашыў уцякаць, пакінуўшы ў шпіталі ў Салігорску свае асабістыя рэчы. На перакладных удалося дабрацца да Віцебску. Па прыезьдзе, у 2 гадзіны ночы пешшу пайшоў у гарадзкі траўмапункт, каб зьняць пабоі. Але калі вярнуўся ў свой пакой у інтэрнаце, адпачыць ня змог — неўзабаве да яго завіталі прадстаўнікі сьледчага камітэту Чыгуначнага раёну Віцебску...

На раніцы пасьля бяссоннай ночы Аляксандар Кірылаў зьвярнуўся ў пракуратуру Віцебску з заявай аб зьдзяйсьненьні супраць яго злачынстваў, прадугледжаных Крымінальным кодэксам. Таксама, як паведаміў аднапартыец Кірылава сустаршыня незарэгістраванай кансэрватыўнай партыі «Белая Русь» Сяргей Рыжоў, былі накіраваныя звароты ў «Міжнародную амністыю» і ў Незалежную псыхіятрычную асацыяцыю Расеі з заклікам правесьці незалежнае расьсьледаваньне сытуацыі вакол Кірылава і нядаўна вызваленага ад прымусовага лячэньня ў Віцебскім абласным псыхіятрычным шпіталі доктара Ігара Пастнова.

Бюлетэнь “За правы чалавека” выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.